# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМУНІКАТЫЎНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

**Пышнюк Алена Аляксееўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай
установы адукацыі "Сярэдняя агульнаадукацыйная школа
№ 23 г. Магілёва"
(Магілёў, Беларусь)

Выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій (ІКТ) у навучанні дазваляе разглядаць школьніка як цэнтральную фігуру адукацыйнага працэсу і вядзе да змены стылю ўзаемаадносін паміж суб'ектамі гэтага працэсу. Настаўнік перастае быць асноўнай крыніцай інфармацыі і займае пазіцыю чалавека, які арганізуе самастойную дзейнасць вучняў і кіруе ёй. Уменне апрацоўваць інфармацыю на сённяшні дзень з'яўляецца вельмі каштоўным здабыткам, таму сучасны настаўнік актыўна ўкараняе ў адукацыйны працэс інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі.

Трэба памятаць, што ІКТ – гэта не толькі тэхналогіі, якія дазваляюць шукаць, апрацоўваць і засвойваць інфармацыю з розных крыніц, у тым ліку і з інтэрнэту. Гэта таксама і выкарыстанне самых розных навучальных праграм.

На ўроках беларускай мовы і літаратуры камп'ютар выкарыстоўваецца на наступных этапах навучання:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

• тлумачэнне новага матэрыялу;
• замацаванне;
• паўтарэнне;
• кантроль ведаў, уменняў і навыкаў.

Найбольш распаўсюджанымі ў нашай дзейнасці з'яўляюцца наступныя інтэрактыўныя адукацыйныя мадэлі:
• мультымедыйныя прэзентацыі, выкананыя ў праграме MS Power Point;
• аўдыякнігі, фонахрэстаматыі;
• тэкставы рэдактар;
• інтэрнэт-рэсурсы;
• тэлебачанне і кіно;
• тэсты;
• электронныя падручнікі [1].

Адной з найбольш эфектыўных форм прадстаўлення матэрыялу на ўроках ***беларускай літаратуры*** з'яўляюцца прэзентацыі ў фармаце MS Power Point, выкарыстанне якіх спрыяе візуалізацыі вучэбнага матэрыялу, развіццю творчага падыходу пры выкананні вучэбных заданняў, а таксама інтэграцыі з сумежнымі дысцыплінамі: гісторыяй, сусветнай мастацкай культурай, музыкай. Вучні за ўрок могуць не толькі пазнаёміцца з партрэтамі, фатаграфіямі, ілюстрацыямі, але і прагледзець урыўкі з фільмаў, праслухаць аўдыязапісы, музычныя ўрыўкі і нават пабываць на віртуальнай экскурсіі ў музеі. Найбольш эфектыўнымі формамі ўрока пры выкарыстанні такіх прэзентацый з'яўляюцца ўрок-лекцыя, урок-віртуальная экскурсія, урок-семінар.

На ўроках па вывучэнні біяграфіі пісьменнікаў часта выкарыстоўваюцца інтэрнэт-сайты, прысвечаныя класікам беларускай літаратуры. З іх дапамогай можна стварыць партрэтныя галерэі, фанатэку: зрабіць запісы выканання твораў самімі аўтарамі ці майстрамі-дэкламатарамі, падабраць відэафрагменты.

Шмат цікавай інфармацыі для настаўніка-філолага змяшчаецца і на сайтах беларускіх музеяў, архіваў, музычных калектываў, тэатраў, беларускамоўных газет і часопісаў. Матэрыялы гэтых сайтаў з'яўляюцца карыснымі і ў арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў па падрыхтоўцы да ўрокаў.

У адукацыйным працэсе зараз набываюць новае гучанне аўдыякнігі, фонахрэстаматыі як складнікі ў вучэбна-метадычным комплексе па вывучэнні беларускай літаратуры ў 5–11 класах. Аднак беларускамоўная інтэрнэт-прастора пачала развівацца адносна нядаўна, таму сучасных лічбавых фонахрэстаматый не вельмі многа.

За апошні час на сайце МА РБ *http // adu.by* у дапамогу настаўнікам размешчаны змястоўныя электронныя вучэбна-метадычныя комплексы па беларускай літаратуры, якія ўяўляюць сабой падборку неабходных для засваення зместу вучэбнай праграмы матэрыялаў: мастацкіх тэкстаў, відэаролікаў,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

займальных матэрыялаў, тэстаў, партрэтаў пісьменнікаў і г.д. Матэрыял сістэматызаваны па класах, па раздзелах, што робіць навігацыю па сайце вельмі зручнай.

Выкарыстанне ІКТ на ўроках ***беларускай мовы*** садзейнічае фарміраванню трывалых арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў, узбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў, валоданню нормамі літаратурнай мовы.

Шырокае распаўсюджанне ў настаўніцкай дзейнасці на этапе кантролю за ведамі, уменнямі, навыкамі вучняў атрымалі тэставыя праграмы (у прыватнасці, "КРАБ 2"), што прызначаны спецыяльна для стварэння і правядзення тэстаў. Гэты спосаб арганізацыі навучальнага працэсу зручны і просты для ацэньвання ў сучаснай сістэме апрацоўкі інфармацыі. Ён прадугледжвае магчымасць хутчэй і аб'ектыўней, чым пры традыцыйным спосабе, выявіць праблемы ў ведах навучэнцаў.

Для навучэнцаў з высокім узроўнем ведаў у старшых класах можна выкарыстоўваць матэрыялы сайта "Электронны рэпетытар", размешчанага па адрасе *http://vedy.by*. Тут шырока прадстаўлены матэрыялы па розных раздзелах мовазнаўства [2]. Выкананне тэставых заданняў, прапанаваных на сайце, спрыяе індывідуалізацыі і дыферынцыяцыі навучання, росту ўнутранай матывацыі вучняў.

Зацікаўлены школьнікі і ў выкарыстанні дадатаку Web 2.0 "Learning Apps. org " для стварэння інтэрактыўных модулей, якія можна прымяняць у прапанаваным выглядзе ці ствараць уласныя. Гульнёвая форма дапамагае паўтарыць, абагульніць вывучаны матэрыял, таму такі электронны рэсурс прыносіць максімальную карысць пры выкладанні беларускай мовы на другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

У вучэбным працэсе настаўнікі актыўна карыстаюцца электронным вучэбна-метадычным комплексам па беларускай мове, размешчаным на сайце НІА РБ, які ўяўляе сабой падборку неабходных матэрыялаў: прэзентацый па тэме, трэніровачных практыкаванняў, тэстаў, дыдактычных гульняў, табліц, памятак, апорных схем. Пералічаныя матэрыялы дапамагаюць павысіць якасць ведаў, а таксама цікавасць вучняў да прадмета.

Такім чынам, выкарыстанне ІКТ на ўроках беларускай мовы і літаратуры дазваляе:

– пашырыць магчымасці прад'яўлення вучэбнай інфармацыі;

– сфарміраваць у вучняў уменне працаваць з інфармацыяй, развіць камунікатыўныя здольнасці;

– павялічыць матывацыю вучэння;

– даць вучню максімальна магчымы для яго аб'ём вучэбнага матэрыялу;

– пашырыць наборы прымяняемых вучэбных задач;

– якасна змяніць кантроль за дзейнасцю вучняў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Але дасягнуць гэтага не так проста, таму што толькі сістэмнае і мэтанакіраванае прымяненне інфармацыйна-камунікатыўных сродкаў навучання ў адукацыйным працэсе дазваляе аптымізаваць дзейнасць настаўніка на ўроку, г. зн. павысіць якасць навучання школьнікаў за кошт паляпшэння якасці дзейнасці настаўніка ў выкладанні прадмета. Акрамя таго, выкарыстанне ІКТ – добры спосаб не адстаць ад часу і ад сваіх вучняў.

**Літаратура**

1. Жуковіч, М. В. Лічбавыя адукацыйныя рэсурсы і інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі ў працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры ў 5–11 класах агульнай сярэдняй школы. – Рэжым доступу: Дата доступу: 21.04.2016.
2. Праграма "Электронны рэпетытар" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http :// vedy.by/Contents/Item/Display/3877. – Дата доступу: 20.04.2016.
3. LearningApps.org [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://learningapps.org/myapps.php. – Дата доступу: 20.04.2016.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова